Сіманава, І. С. Традыцыйны этыкет беларусаў: гістарыяграфія праблемы / І. С. Сіманава // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. — Минск: БГУ, 2011. — С. 123 – 127

**І. С. СІМАНАВА**

# ТРАДЫЦЫЙНЫ ЭТЫКЕТ БЕЛАРУСАЎ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

Этнаэтыкет – канструктыўны элемент нацыянальнай культуры, што аб'ядноўвае нормы паводзін і зносін, і ў пэўнай ступені з'яўляецца адным з ідэнтыфікаваных фактараў этнічнай супольнасці.

Традыцыйны этыкет беларусаў не з'яўляўся прадметам спецыяльнага комплекснага даследавання, аднак асобныя элементы дадзенай формы культуры



знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх абагульняючых і тэматычных працах па беларускай этнаграфіі.

Першыя даследаванні, у якіх закранаецца дадзеная праблематыка, прыпадаюць на сярэдзіну XIX ст. Нягледзячы на тое, што перыяд XIX – пачатку XX ст., які ў гісторыі беларускай этналогіі традыцыйна лічыцца часам назапашвання фактычнага этнаграфічнага матэрыялу, калі дамінавалі даследаванні эмпірычнага характару, тым не менш з'яўляецца самым плённым у вывучэнні традыцыйнага этыкету беларусаў.

Найбольш поўна ў дадзены перыяд былі даследаваны такія аспекты этыкету, як моўныя прывітальныя формулы, гасціннасць і застольныя звычаі, унурысямейныя і міжпакаленныя адносіны, грамадскія стасункі. Частковае адлюстраванне знайшла этыкетная атрыбутыка (у першую чаргу ўвага звярталася на асобныя элементы касцюма) і пытанні, звязаныя з арганізацыяй прасторы.

Сярод самых першых прац, дзе шырока і падрабязна апісаны этыкетныя сітуацыі, неабходна вылучыць працу М. Анімеле «Быт беларускіх сялян» [1]. Аўтар апісаў этыкетную сітуацыю прывітанняў у сялянскім асяроддзі, акцэнтуючы ўвагу на асаблівасцях, характэрных для праваслаўных і каталікоў, паказаў сістэму размяшчэння членаў сям'і за абедзенным сталом, звярнуў увагу на пытанне гасціннасці, у сувязі з чым падрабязна апісаў звычай «прынукі» і, што немалаважна, правёў параўнанне застольнага этыкету беларускага селяніна ў будзённыя дні і ў час святкаванняў [1, с. 142–147].

Этыкетная праблематыка знайшла шырокае адлюстраванне і ў працах беларускіх этнографаў другой паловы XIX – пачатку XX ст., такіх як П. В. Шэйн, Е. Р. Раманаў і М. Я. Нікіфароўскі.

Значная частка II тома «Матэрыялаў для вывучэння быта і мовы рускага насельніцтва Паўночна-заходняга краю» П. В. Шэйна прысвечана шматлікім сітуацыям прывітання і пажаданням. У працы праводзіцца 35 моўных формул прывітанняў, што ўжываліся пераважна ў Віцебскай і Гродзенскай губерніях [19, с. 500–517]. Гэта даследаванне цікава ў першую чаргу тым, што апісаныя ў працы вербальныя формулы прадстаўлены ў кантэксце іх ужывання.

Выключную цікавасць пры вывучэнні традыцыйнага этыкету беларусаў уяуляе даследаванне Е. Р. Раманава «Нарыс быта жабракоў Магілёўскай губерніі і іх умоўная гаворка», дзе аўтар паказаў стаўленне вясковага насельніцтва да жабракоў, а таксама апісаў камунікатыўную сітуацыю, знешнім праяўленнем якой з'яўляюцца этыкетныя паводзіны прадстаўнікоў гэтых сацыяльных катэгорый [13, с. 119, 123–124].

Працягваючы аналіз уклада Е. Р. Раманава ў даследаванне этыкету беларусаў, нельга абысці працу «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерніі» [8]. У першай частцы працы ў раздзеле «Сям'я» прыводзяцца звесткі, якія асвятляюць пытанні ўнутрысямейнага падзелу працы, нормы паводзін мужа і жонкі ў дачыненні адзін да аднаго [8, с. 31–33]. Не пакінуў па-за ўвагай этнограф і застольныя звычаі беларускага селяніна [12, с. 39].

Дадзены аспект традыцыйнага этыкету беларусаў знайшоў адлюстраванне і на старонках «Нарысаў прастанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі…»



М. Я. Нікіфароўскага [9] . Этнограф пакінуў дастакова абшырную інфармацыю аб «застольных правилах и приличиях», апісаў парадак прыёму ежы, што непасрэдна ўплываў на арганізацыю працоўнай дзейнасці селяніна [9, с. 55–65]

М. Я. Нікіфароўскі стаў адным з першых беларускіх этнографаў, хто звярнуў увагу на атрыбутыку этыкетнай сітуацыі [9, с. 107, 128–136].

Больш сціпла ў параўнанні з папярэднімі працамі камунікатыўныя паводзіны беларусаў прадстаўлены ў даследаванні І. А. Сербава «Вічынскія паляне» [14]. Да дадзенай праблемы аўтар звяртаецца у апошнім раздзеле «Сельскагаспадарчы быт». У падраздзеле «Ежа і напіткі» змяшчаюцца цікавыя звесткі аб

застольным этыкеце вічынцаў [14, с. 75]. Фактычна на апошняй старонцы даследавання этнограф зафіксаваў нешматлікія формы прывітанняў і пажаданняў, якія выкарыстоўваліся мясцовым насельніцтвам у штодзённым жыцці [14, с. 78]. У трэцім раздзеле «Насельніцтва» (падраздзеле «Аздобы») Сербаў засяроджвае ўвагу на такіх этыкетных атрыбутах як фартух і пояс [14, с. 47].

Даволі змястоўны і каштоўны матэрыял па традыцыйнаму этыкету палешукоў змешчаны ў працы Ч. Пяткевіча «Рэчыцкае Палессе» [11]. У другой частцы, прысвечанай духоўнай культуры, аўтар прыводзіць шырокае кола моўнаэтыкетных формул, характэрных для усходняга рэгіёна Палесся. У прыватнасці, даследчык зафіксаваў прывітальныя выразы, якія ўжываюцца пры розных жыццёвых абставінах, благаславенні і пажаданні, тосты і падзякі, просьбы і адмовы [11, с. 612–625].

Этыкетныя сітуацыі знайшлі адлюстраванне ў працах М. Федароўскага, Ю. Ф. Крачкоўскага, У. М. Дабравольскага, М. В. Доўнар-Запольскага, А. К. Сержпутоўскага.

Шырокі набор этыкетных прыёмаў, якія мелі месца пад час падрыхтоўкі да шлюбу сярод беларусаў, апісаў М. Федароўскі [18]. Этнограф падрабязна перадае багаты спектр іншасказанняў, якія ўжываліся пад час сватаўства, апісвае знакавыя паводзіны ўдзельнікаў даведак, заручын, запоін. У прыватнасці М. Федароўскі адзначаў: «Звычай жа такі, што пакуль свахі не прыйдуць да добрых высноў, да таго часу яны не толькі не сядуць, але ад парога за першую бэльку ў столі не пяройдуць» [18 с. 18]. Таксама ў даследаванні даволі падрабязна раскрываецца традыцыя запрашэння гасцей на вяселле [18, с. 120], прыводзяцца прыклады паводзін маладых напярэдадні ўступлення ў шлюб.

У межах сямейнай абраднасці камунікатыўныя зносіны беларусаў знайшлі адлюстраванне ў працы Ю. Ф. Крачкоўскага «Нарысы быта заходнерускага селяніна» [7]. У дадзеным даследаванні аўтар коратка ўзгадвае асаблівасці арганізацыі прасторы ў этыкеце беларусаў пад час святкавання хрэсьбін, адлюстроўвае ўзаемнае размяшчэнне ўдзельнікаў свята [7, с. 168–169].

Комплексная інфармацыя аб этыкеце сямейных узаемаадносін сканцэнтравана ў працах М. В. Доўнар-Запольскага [6] і У. М. Дабравольскага [5].

Даволі яскрава этыкетныя традыцыі ў асяроддзі беларускіх сялян прасочваюцца пад час грамадскіх мерапрыемстваў, што ўключалі і калектыўную працу. У адным з нарысаў А. К. Сержпутоўскага, прысвечаных звычаю талакі, зафіксавыны этычныя нормы працы, характэныя для беларусаў. Этнограф адзначаў, што талака



ў беларусаў збірала лепшых працаўнікоў, якія спаборнічалі ў спрытнасці і працавітасці [15, с. 212–213].

Вышэй прыведзеныя прыклады даследаванняў у галіне камунікатыўных паводзін у поўным сэнсе не з'яўляюцца навуковымі. Большасць элементаў традыцыйнага этыкету беларусаў не вылучаліся асобна, фарміруючы сістэму, а фіксаваліся ў разделах, прысвечаных матэрыяльнай культуры; разглядаліся ў межах сямейнай абраднасці і грамадскіх традыцый, уключаліся ў працы, што змяшчалі малыя фальклорныя жанры. Дадзеная акалічнасць патрабуе на сённяшні дзень комплекснага і дэталёвага аналізу шырокага спектра базавага этнаграфічнага матэрыялу.

Распрацоўка пытанняў, звязаных з вывучэннем традыцыйнага этыкету, на новы даследчы ўзровень выходзіць у савецкі час на мяжы 70–80-х гг. ХХ ст. З'яўляюцца працы, прысвечаныя тэарэтычнаму абгрунтаванню дадзенай праблемы, распрацоўваюцца праграмы даследавання этнаэтыкету, якія з'яўляюцца актуальнымі і запатрабаванымі сучаснымі даследчыкамі.

Ключавымі на сённяшні дзень застаюцца пытанні, якія галоўным чынам звязаны з аналізам вытокаў традыцыйнага этыкету беларусаў, яго структуры, функцый, месца і ролі ў сістэме іншых стэрэатыпных форм паводзін. Дадзеная праблематыка знайшла адлюстраванне ў артыкулах А. Л. Тапаркова, часткова напісаных на беларускім матэрыяле і прысвечаных аналізу застольнага этыкету славян [16; 17].

У апошні час значная ўвага беларускіх лінгвістаў надаецца пытанням традыцыйнага этыкету. У поле іх зроку трапляюць у першую чаргу вербальныя кампаненты стасункаў. Сваёй інфармацыйнасцю вылучаецца праца Н. С. Грэбеншчыковай «Гісторыя рускага прывітання (на усходнеславянскім фоне)» [4]. Манаграфія напісана на аснове фальклорнага матэрыялу беларусаў, рускіх і ўкраінцаў. Аўтар не толькі прасочвае гісторыю фарміравання і эвалюцыю моўных прывітальных формул, характэрных для ўсходнеславянскіх этнасаў, але звяртае ўвагу і на кінэсічныя элементы. Даследчыца адзначае: «…в белорусском и в украинском этикете «вежество» связывается в первую очередь с рукопожатием и шапкой. … Русские люди знали один способ приветствия – поклон, тогда как украинцы и белорусы «ручкались» [4, с. 23]. Пытанне «уваходу ў этыкетную сітуацыю і выхаду з яе» [2, с. 20] знайшло адлюстраванне ў артыкулах Т. Піваварчык (прысвечаны традыцыйным беларускім развітальным формулам) [10] і В. Васілевіч, якая звяртаецца да моўных дабразычлівых выразаў, аналізуе іх вытокі [3].

На сучасным этапе праблема традыцыйнага этыкету беларусаў ускосна закранаецца і ў працах беларускіх этнолагаў, прысвечаных у першую чаргу грамадскім стасункам і сям'і, традыцыям народнага харчавання і этнапедагогікі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што асобныя элементы народнага этыкету беларусаў знайшлі шырокае адлюстраванне на старонках разнапланавых даследаванняў, якія могуць з'явіцца трывалай базай для далейшага і больш глыбокага вывучэння дадзенай праблематыкі.



## ЛІТАРАТУРА


1. *Анимелле, М.* Быт белорусских крестьян / М. Анимелле // Этнографический сборник. Вып. 2. – СПб., 1854. – 268 с.
2. *Байбурин, А. К.* Об этнографическом изучении этикета / А. К. Байбурин // Этикет у народов Передней Азии. М. : Наука, 1988. – 262 с.
3. *Василевич В.* Благопожелания в русском, белорусском и болгарском языках / В. Василевич // Антропоцентричный підхід у дослідженні мови. Ніжин : ТОВ Наука-сервис. Гродна, 1998. – С. 193–196.
4. *Гребенщикова, Н. С.* История русского приветствия (на восточнославянском фоне) / Н. С. Гребенщикова. – Гродно : ГрГУ, 2004. – 306 с.
5. *Добровольский, В. Н.* Смоленский этнографический сборник/ В. Н. Добровольский // Записки РГО по отделению этнографии. – Ч. 2. – СПб.,1893. – 443с.
6. *Довнар-Запольский, М. В.* Очерки семейственного обычного права крестьян Минской губернии / М. В. Довнар-Запольский // Исследования и статьи. Т. 1. Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. Киев, 1909. – 487с.
7. *Крачковский, Ю. Ф.* Очерки быта западнорусского крестьянина / Ю. Ф. Крачковский // Виленский сборник. – Ч. 1. – Вильно, 1869. – 280с.
8. Материалы по этнографии Гродненской губернии. Выпуск 1. По поручению Виленского учебного округа редактировал Е. Романов. Издание Управления Виленского учебного округа, – Вильно : 1911. – 238 с.
9. *Никифоровский, Н. Я.* Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губернская типография, 1895. – 552 с.
10. *Піваварчык, Т.* Да класіфікацыі этыкетных адзінак: беларускія развітальныя формулы / Т. Піваварчык // Антропоцентричный підхід у дослідженні мови. Ніжин : ТОВ Наука-сервис. Гродна, 1998. С. 200-204.
11. *Пяткевіч, Ч.* Рэчыцкае Палессе / Часлаў Пяткевіч. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2004. – 670 с.
12. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вып. 8: Быт белоруса. – Вильно : Типография А. Г. Сыркина, 1912. – 600с.
13. *Романов, Е. Р.* Очерк быта нищих Могилёвской губернии и их условный язык («Любецкий лемент»)/ Е. Р. Романов // Этнографическое обозрение. – 1890. – № 4. – С. 119–149.
14. *Сербаў, І. А.* Вічынскія паляне. Матэрыяльная культура. Этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся / І. С. Сербаў. – Мінск : БФК, 2005. – 88с.
15. *Сержпутовский, А. К.* Очерки Белоруссии. Талака. / А. К. Сержпутовский // Живая старина. – 1907. – Вып. 4. – С. 210–214.
16. *Топорков, А. Л.* Происхождение элементов застольного этикета у славян А. Л. Топорков // Этнические стереотипы поведения. М. : Наука, 1985. – 212с.
17. *Топорков, А. Л.* Структура и функции сельского застольного этикета у восточных славян / А. Л. Топорков // Этнознаковые функции культуры. М.: Наука, 1991. – 224с.
18. *Федароўскі, М.* Люд беларускі. Вяселле / М. Федароўскі. – Мінск : Полымя, 1991. – 123 с.
19. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края / П. В. Шейн. – Т. 2. Сказки, анекдоты, легенды, предания, воспоминания, пословицы, загадки, приветствия, пожелания, божба, проклятия, ругань и проч. – СПб., 1893. – 715с